Хрысціна Янэке

кандыдат гістарычных навук,
менеджар у сферы культуры, дырэктар агенцтва
Tradicia History Service (Германія)

## У сэрцы Еўропы: нямецкі погляд на беларускія музеі

На першы погляд, не так проста ажыццяўляць новыя адкрыцці ў эпоху глабалізацыі. Тым больш, немагчымым гэта здаецца ў цэнтры Еўропы. Але менавіта тут ідзе і развіваецца музейнае жыццё, дагэтуль малавядомае заходнім спецыялістам. Калі іх і цікавіць усходнееўрапейская музейная прастора, то звяртаюцца яны ў першую чаргу да Расіі, а беларускія музеі згадваюцца ў кантэксце расійскіх музеяў.

Аднак, пражыўшы ў Беларусі амаль два гады, я магу з упэўненасцю сказаць, што тут ёсць што адкрываць: беларускія музеі прапаноўваюць многа магчымасцей для сумесных еўрапейскіх праектаў. Мой вопыт заснаваны найперш на актыўным супрацоўніцтве з Музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Мне, як спецыялісту з Германіі, прадстаўлена ўнікальная магчымасць удзельнічаць у працэсе распрацоўкі новай экспазіцыйнай канцэпцыі гэтага музея. Запрашэнне з боку беларускіх калег сведчыць аб іх даверы і зацікаўленасці ў абмене вопытам, шырокім патэнцыяле развіцця адносін паміж нашымі краінамі. Акрамя таго, праца ў рамках праекта Інстытута імя Гётэ «Музеі як цэнтры адукацыі XXI ст.» дапамагла мне ўстанавіць кантакты з іншымі музеямі Мінска і рэгіёнаў, азнаёміцца з рознымі аспектамі работы беларускіх музеяў. На аснове атрыманага вопыту я б хацела сфармуляваць некалькі тэзісаў аб агульных кропках магчымага супрацоўніцтва па арганізацыі міжнацыянальных праектаў і ўзаемадзеяння на міжнародным узроўні.

У беларускай музейнай прасторы ёсць музеі, якія вядомыя па-за межамі краіны. Сумесныя праекты і культурны турызм могуць у перспектыве ўзмацніць іх значнасць.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзякуючы актыўнай выставачнай і шырокай арганізацыйнай рабоце, а таксама нацыянальнаму і агульнакультурнаму значэнню іх дзейнасці, разнастайнасці музейных збораў сярод больш за 1,6 тыс. музеяў Беларусі несумненна вылучаюцца такія, як Нацыянальны мастацкі музей, Нацыянальны гістарычны музей, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальны Полацкі музей-запаведнік, Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» і Замкавы комплекс «Мір», Гомельскі палацава-паркавы ансамбль, Літаратурны музей Янкі Купалы і Музей абароны Брэсцкай крэпасці, музей-запаведнік у Заслаўі. Адметнымі па сваёй тэматыцы мне падаюцца таксама мемарыяльны комплекс «Хатынь» і Музей Марка Шагала ў Віцебску.

Усе пералічаныя музеі прадстаўляюць мастацтва, культуру і гісторыю Беларусі. Відавочнай з'яўляецца іх скіраванасць на дэманстрацыю нацыянальнай ідэнтычнасці, імкненне замацавацца на карце Еўропы, якія дасягаюцца спецыфікай пастаянных экспазіцый. Важны ўнёсак у дасягненне гэтай мэты (напрыклад, дакументаванне багатай і разнастайнай гісторыі археалагічных раскопак, этнаграфічных традыцый і абрадаў) маглі б зрабіць і іншыя музеі краіны адкрытымі для замежных даследчыкаў.



Беларуская музейная прастора характарызуецца непаўторнай разнастайнасцю, мэтанакіраванае развіццё якой шляхам грамадскай кааперацыі, стварэння аб'яднанняў дапаможа выявіць адметныя асаблівасці беларускіх музеяў.

Гістарычнае развіццё краіны прывяло да ўзнікнення развітай сеткі малых і сярэдніх музеяў, разнастайных не толькі па сваёй тэматыцы (культура, гісторыя і прырода Беларусі), але і паводле тыпаў музеяў. Да іх адносяцца, напрыклад, літаратурныя музеі, мемарыяльныя музеі знакамітых асоб і шматлікія школьныя і ведамасныя музеі, якія пры дапамозе актуальных тэматычных выставак могуць фарміраваць уяўленне аб беларускай культуры і грамадстве ў свеце.

Такая шматзначнасць адметна адлюстроўвае складаную гісторыю Беларусі, з рознымі рэгіянальнымі асаблівасцямі, мовамі, гістарычнымі канфесіямі. Разам з арыгінальнай мастацкай сцэнай, падтрымкай сучаснага мастацтва, стварэннем належных умоў для развіцця музеяў, прадстаўленнем наведвальніку магчымасці ўдзельнічаць у музейнай рабоце, а таксама грамадзянскай актыўнасцю дадзеная сетка музеяў можа стаць «паслом» Беларусі за мяжой.

З пункту гледжання замежных музейных спецыялістаў, Беларусь уяўляе вялікае поле для супрацоўніцтва. Мэтанакіраваная падтрымка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сумесных праектаў можа ў доўгатэрміновай перспектыве забяспечыць уключэнне музеяў Беларусі ў міжнародную музейную прастору.

Беларусь знаходзіцца на перакрыжаванні культур і цывілізацый. Яна выступае сувязным звяном паміж Заходняй і Усходняй Еўропай, аб'ядноўваючы беларускія, польскія, украінскія, літоўскія і рускія культурныя элементы, а таксама заходнюю і славянскую моўную гісторыю. Гэта знаходзіць адлюстраванне ў еўрапейскіх музейных, выставачных і калекцыйных канцэпцыях, у гарадскіх музейных цэнтрах і экалагічным турызме, у высокіх адукацыйных стандартах для музеяў і крэатыўных стратэгіях выжывання. Хацелася б, каб ініцыятыву па абмене вопытам з боку беларускіх музеяў актыўна падтрымалі іншыя еўрапейскія музеі, паколькі такія задачы, як існаванне ў новых фінансава-эканамічных умовах, пазіцыянаванне на рынку шляхам увядзення новых паслуг, алічбоўка музейных збораў, стаяць перад кожным музеем.

Неабходна адзначыць, што адзін беларускі музей у Германіі ўсё ж прадстаўлены. Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца членам аб'яднання Германа-Расійскага музея «Берлін-Карлсхорст». З пункту погляду музейных спецыялістаў хацелася б, каб колькасць кантактаў ва ўмовах глабалізацыі павялічвалася.



Тамара Джумантаева

кандыдат культуралогіі,
дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка
(г. Полацк, Беларусь)

## Стратэгія захавання культурнай спадчыны Полацка як фактар устойлівага развіцця музея-запаведніка

У эпоху глабалізацыі постіндустрыяльная цывілізацыя ўсвядоміла высокі патэнцыял культурнай спадчыны, неабходнасць яго захавання і эфектыўнага выкарыстання як аднаго з важнейшых рэсурсаў сусветнай супольнасці. Любыя страты спадчыны непазбежна адбіваюцца на ўсіх абсягах жыцця сучаснага і будучых пакаленняў, прыводзяць да духоўнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ